3. Мордовин-Залесский, А. К. Послужной список как исторический источник / А. К. Мордовин-Залесский // Преподавание истории в школе. – 2020. – № 7. – С. 89–92.

4. Российский государственный военно-исторический архив (РГВИА). – Ф. 409. Оп. 1. Д. 177481. П/с 155-047.

5. Сорокин, А. А. Создание Православного Палестинского общества и деятельность М.П. Степанова (1881–1883 гг.) / А. А. Сорокин, Д. М. Софьин, М. В. Софьина // Научный диалог. – 2025. – № 14(1). – С. 530–546.

6. Черкасская, Н. А. Михаил Петрович Степанов: вхождение в ближний круг великого князя Сергея Александровича / Н. А. Черкасская, Д. М. Софьин, М. В. Софьина // Христианство на Ближнем Востоке. – 2024. – Т. 8. – № 4. – С. 73–97.

**Кароль М.М.**

## “БЕРЕЖЕНОГО БОГ БЕРЕЖЕТ”: “МІНСКІЯ ЕПАРХІЯЛЬНЫЯ ВЕДАМАСЦІ” ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ БАРАЦЬБЫ З ЭПІДЭМІЯМІ ХАЛЕРЫ Ў СЯРЭДЗІНЕ ХІХ – ПАЧАТКУ ХХ ст.

*Ключавыя словы: Беларусь, «Мінскія епархіяльныя ведамасці», эпідэміі, халера, перыёдыка, гісторыя медыцыны.*

Халера – вострая інфекцыя, першая эпідэмія якой была зафіксавана ў першай трэці ХІХ ст. Затым назіралася шэсць хваляў эпідэміі, што забралі мноства жыццяў, халера ператварылася ў адну з самых небяспечных хвароб. Медыкі розных краін прыкладалі намаганні для яе прафілактыкі і лячэння. Патагенез халеры быў акрэслены ў 1854 г. Філіпа Пачыні, але на той момант у навуковай супольнасці панавала думка аб «міязмах» як прычыне халеры. У 1883 г. Роберт Кох адкрыў бактэрыю халеры і зрабіў выснову, што хвароба перадаецца праз ваду, а не праз паветра. Гэта стала гістарычным прарывам у дыягностыцы і далейшым лячэнні хваробы.

У паведамленнях, змешчаных у «Мінскіх епархіяльных ведамасцях», магчыма прасачыць, якімі сродкамі барацьбы з халерай карысталіся тагачасныя медыкі, якія парады атрымлівала насельніцтва Беларусі для прадухілення заражэнняў.

У другой палове ХІХ ст. шмат увагі надавалі пытанню пашырэння сярод людзей ведаў аб прафілактыцы эпідэмічных захворванняў. У 1871 г. у газеце друкаваўся цыкл пад назвай «Лекцыі грамадскай гігіены і дыетэтыкі». З іх зместу вынікае, што патагенез халеры цікавіў навуковую супольнасць, выказваліся розныя версіі паходжання хваробы, якія, на жаль, былі далёкімі ад рэальнасці. Напрыклад, існавала меркаванне, што з’яўленне халеры звязана са змяншэннем колькасці азону ў паветры: «Згодна з назіраннямі Бокеля і прафесара Вольфа з’яўленне халеры супадае з надзвычайным змяншэннем азону ў паветры, а пачатак знікнення яе – з паступовым павелічэннем іх» [1, с. 140]. У лекцыях уздымалася вельмі важная праблема: недахоп урачоў і іх нізкі уплыў на грамадскую думку, у сваю чаргу вялікі аўтарытэт мелі самавукі, да якіх звярталіся людзі [4, с. 35].

Адзначалася важнасць паляпшэння водазабеспячэння: належала сачыць, каб побач з крыніцамі пітной вады не знаходзіліся хлявы, могілкі, клаакі і г.д. У межах горада павінен быць забаронены зліў з фабрык ў рэкі. На жаль, у Мінску гэтая парада не выконвалася, а забруджванне Свіслачы ўплывала на здароўе людзей [2, с. 214]. У пачатку 1870-х гг. ужо было ўсвядомлена, што стан вады ўплывае на распаўсюджанне халеры, але эфектыўных спосабаў лячэння хваробы яшчэ не ведалі. Таму выкарыстоўвалі розныя мікстуры, у складзе былі нават опіум і морфій [3, с. 319].

На старонках газеты публікаваліся царкоўныя летапісы, дзе адзначаліся выпадкі эпідэмій халеры. Святар Сенненскай царквы Клімент Савіч зафіксаваў, што ў жніўні 1871 г.

халера пачалася ў вёсцы Асташын Навагрудскага павета, памерла 60 чалавек. У зробленым ім апісанні хваробы прыкметна, як рэальная прычына эпідэміі змешвалася з недакладнымі ўяўленнямі: «Развіццю эпідэміі садзейнічала асабліва тое, што сяляне ля ўваходу ў свае дамы маюць гнойныя лужыны, якія ў моцную летнюю спёку распаўсюджваюць міязмы, што заражаюць паветра. Заўважна, што халера не мінула ні аднаго таго дому, у двары якога знаходзілася падобная лужына» [6, с. 526]. У 1870-я гг. яшчэ трымалася ўяўленне, што халера распаўсюджваецца праз «міязмы», а не праз адкіды і ваду.

Пры гэтым у другой палове XIX ст. шырокім попытам карысталася народная медыцына. Напрыклад, у рэдакцыю «Мінскіх епархіяльных ведамасцей» звярнуўся святар Мікольскі з рэкамендацыяй лячыць халеру белай чамярыцай [5, с. 283]. У 1883 г. у газеце прапаноўвалася адужваць захворванне пры дапамозе сланечніка або эўкаліпта [7, с. 587–592].

У 1884 г. у «Мінскіх епархіяльных ведамасцях» быў надрукаваны ліст студэнта-медыка 3-га курса Фёдара Буркача. Той даводзіў эфектыўнасць такога спецыфічнага спосабу лячэння: «палова чаркі дзёгцю і палова чаркі драўлянага [аліўкавага] алею – гэта прыём для дарослага чалавека; прымаць належыць гадзіны праз тры». Гэты рэцэпт яму паведаміў 70-гадовы старажыл-«кашавар» Іван, а гісторыя яго атрымання наогул выглядала даволі маляўніча. Каля мястэчка Петрыкаў на рацэ Прыпяць Ф. Буркач пабачыў плыт з хворым. Той спыніўся побач з населеным пунктам і чакаў, пакуль мужчына памрэ, каб мець магчымасць яго пахаваць. У гэты час прыплыў іншы плыт, на якім быў Іван, які прапанаваў акрэслены вышэй сродак. Як пісаў студэнт-медык, «магчыма, людзі навукі і пасмяюцца з гэтага немудрагелістага сродку, але я, паўтараю, быў відавочцам хуткага ўваскрэсення (ён да вечара ўжо перасоўваўся на нагах) хворага, у смерці якога я не сумняваўся» [8, с. 511].

У тым жа нумары была апублікавана нататка «Медыцынскія парады» з больш навукападобным спосабам барацьбы з халерай: істотнае падскурнае упырскванне салёна-шчолачнай вады [8, с. 512].

У 1890-я гг. ужо было вядома даследаванне Роберта Коха, але пакуль што яно ўспрымалася як не да канца даказанае, хаця і прызнавалася, што халера перадаецца праз вільгаць (сырую ваду або вільготныя рэчы хворага), а не праз паветра. Нягледзячы на адсутнасць згоды ў медыцынскай супольнасці і захаванне ўплыву тэорыі «міязмаў», у гэты час пачынаюць рабіць асаблівы акцэнт на нізкі ўзровень гігіены як адну з прычын распаўсюджвання халеры.

У 1890 г. у газеце былі надрукаваны практычныя рэкамендацыі для насельніцтва ў сувязямі з успышкамі халеры ў Іспаніі і Італіі. Самымі цікавымі з іх з'яўляюцца спосабы лячэння захворвання: прапаноўвалася лячыць опіумам, морфіем (праз уколы пад скуру) і атрутай у выглядзе стрыхніну [9, с. 521–528]. Для лячэння выкарыстоўвалі таксама кафеін, націранне ўсяго цела і падскурныя ін'екцыі спалучэннем солі, соды і вады. Некаторыя парады адпавядаюць сучасным падыходам. Напрыклад, прытрымлівацца дыеты: хвораму варта было даваць піць булён [10, с. 552–558].

Усе друкаваныя рэкамендацыі для насельніцтва неабходна было капіраваць і распаўсюджваць, каб стварыць магчымасці для больш шырокай агалоскі і інфармавання вялікай колькасці людзей [11, с. 446].

У 1892 г. у «Мінскіх епархіяльных ведамасцях» змясцілі парады вясковаму насельніцтву для барацьбы з халерай. Яны былі звязаны з імкненнем да росту якасці жыцця і насілі агульны прафілактычны характар: старацца мыць рукі з мылам, не спаць на халодным, не злоўжываць алкаголем. З даволі своеасаблівых рэкамендацый адзначым парады піць чай з лімонам і хадзіць у лазню. Прыкметна, што большасць рэкамендацый былі скіраваны на паляпшэнне санітарна-гігіенічнага стану на вёсцы.

Падкрэслівалася неабходнасць своечасова звяртацца да фельчара (медыцынскія работнікі ў той час яшчэ выклікалі ў сялян недавер).

Калі чалавек захварэў, прымаліся наступныя меры: патрабавалася саграваць ногі і жывот, паіць хворага адварам маліны. Усе біялагічныя адкіды неабходна было закопваць у глыбокую яму, а прадметы (падлогу, адзенне, бялізну) мыць з дапамогай шчолачы. Прапаноўваліся спосабы хатняга ачышчэння вады [12, с. 476]

Істотныя зрухі ў рэкамендацыях па прафілактыцы і лячэнні халеры адбыліся ў пачатку XX ст. У 1905 г. выйшлі абавязковыя пастанаўленні аб мерах папярэджання халеры, дзе вялікая ўвага надавалася ачыстцы вады. Правілы датычыліся і царкоўных рытуалаў: цела памерлага не амывалася і хавалася ў труне ў тым самым адзенні, у якім чалавек памёр, на працягу 24 гадзін [13, с. 109–115]. Рабіўся націск на спосабы індывідуальнага засцеражэння ад эпідэміі: неабходна трымацца ізаляцыі, сачыць за рэжымам працы і адпачынку, не есці падазроную ежу, піць кіпячоную ваду, праветрываць памяшканне, пры наяўнасці сімптомаў кіравацца ў бальніцу [13, с. 115–123].

Паколькі «Мінскія епархіяльныя ведамасці» з'яўляліся царкоўным перыёдыкам, то на іх старонках увага надавалася ролі святароў у супрацьдзеянні эпідэміям. У 1907 г. святар Іаан Мажароўскі апублікаваў адмысловы артыкул з выкладам мер перасцярогі [14, с. 349].

У пачатку XX ст. адкрыццё Р. Коха стала агульнапрызнаным, што дазволіла прасоўваць у масы эфектыўныя парады для барацьбы з халерай. У 1908 г. «Мінскія епархіяльныя ведамасці» адзначалі, што людзі без сімптомаў могуць быць пераносчыкамі халеры; настойліва рэкамендавалі не піць сырую ваду, а кіпяціць яе, не есці сырую гародніну і садавіну, мыць рукі і прадукты, не піць напоі, якія маглі быць разбаўлены сырой вадой. Падкрэслівалася, што папулярныя раней сродкі (мікстуры і сывараткі) прызнаны нядзейснымі. Рабіўся акцэнт на важнасці здаровага ладу жыцця ў змаганні з халерай. Апісваліся шляхі перадачы халеры, яе сімптомы. Для таго, каб данесці да насельніцтва рэкамендацыі па абароне ад халеры, выкарыстоўваўся аўтарытэт прыходскіх святароў, якія павінны былі знаёміць прыхаджан і вучняў царкоўна-прыходскіх школ з санітарнымі пастановамі і правіламі [15, с. 223–228].

Сапраўды навуковыя рэкамендацыі ўжо былі заснаваны на разуменні, што халера перадаецца праз біялагічныя вадкасці хворых (ваніты і экскрэменты) і няякасную ваду [16, с. 233].

У гэты час атрымалі пашырэнне эфектыўныя спосабы прафілактыкі распаўсюджання эпідэмій. Але лячэнне той жа халеры яшчэ не было вынайдзена. Таму не павінна здзіўляць выказаная ў 1912 г. прапанова адужваць халеру кіслым малаком: «тры-чатыры гады таму сам Мечнікаў звярнуў увагу на магчымасць забіваць халерных вібрыёнаў пры дапамозе малочнай кіслаты. Вядома, што бактэрыя халеры, нягледзячы на ўсю сваю жывучасць, зусім не выносіць нават слабых кіслот» [17, с. 606]. Працягвалі трапляцца і вельмі неардынарныя сродкі, канешне, сумнеўнай эфектыўнасці. Напрыклад, у 1908 г у «Мінскіх епархіяльных ведамасцях» падаваўся матэрыял пра цудадзейныя ўласцівасці дзягцярнай настойкі, якая быццам бы лекавала не толькі халеру, але і бранхіт з алкагалізмам [15, с. 585].

Такім чынам, у публікацыях «Мінскіх епархіяльных ведамасцей» прасочваецца эвалюцыя ўспрымання халеры і спосабаў яе лячэння. Як можна заўважыць, большасць парад былі скіраваны на тое, каб не заразіцца, а адужванне ставілася ў залежнасць ад моцы арганізму. На жаль, да вынаходніцтва антыбіётыкаў халера заставалася адной з самых смяротных хвароб (памірала амаль палова інфікаваных). Але вялікім прарывам ўжо ў пачатку XX ст. была ідэя, што халеру магчыма прафілактаваць: каранцінам, кіпячэннем вады і мыццём рук. Усё гэта дапамагала знізіць рызыку захворвання.

Таксама паступова адмаўляліся ад старых метадаў лячэння, якія хутчэй падрывалі імунітэт хворых, тым самым шкодзілі ім, а не спрыялі.

Асноўнымі прычынамі распаўсюджання эпідэмій, што было адлюстравана на старонках «Мінскіх епархіяльных ведамасцей», у другой палове XIX – пачатку XX ст. заставаліся: санітарна-гігіенічная нядбайнасць, галеча, адсутнасць гігіенічных ведаў, цяжкі доступ да якаснай вады, яе кепская ачыстка і абыякавае стаўленне да масавага складання бруду паблізу жылых пабудоў і крыніц прэснай вады.


1. Лекции общественной гигиены и диететики, читанные в Минской семинарии штатным врачом оной доктором Архангельским. Лекция пятая // Минские епархиальные ведомости (далей – МЕВ). – 1871. – № 18 (6 мая). – С. 140–142.
2. Лекции общественной гигиены и диететики, читанные в Минской семинарии штатным врачом оной доктором Архангельским. Лекция шестая // МЕВ. – 1871. – № 27 (8 июля). – С. 212–214.
3. Лекции общественной гигиены и диететики, читанные в Минской семинарии штатным врачом оной доктором Архангельским. Лекция девятая // МЕВ. – 1871. – № 40 (7 окт.). – С. 317–319.
4. Лекции общественной гигиены и диететики, читанные в Минской семинарии штатным врачом оной доктором Архангельским. Лекция двенадцатая // МЕВ. – 1872. – № 4 (28 янв.). – С. 30–35.
5. Письмо священника Никольского с указанием на средство против холеры // МЕВ. – 1872. – № 35 (1 сент.). – С. 283–284.
6. Летопись Свято-Троицкой Сенненской церкви Новогрудского уезда // МЕВ. – 1874. – № 16 (30 августа). – С. 524–528.
7. Домашняя медицина // МЕВ. – 1883. – № 19 (1 окт.). – С. 587–592.
8. Медицинские советы // МЕВ. – 1884. – № 19 (1 окт.). – С. 511–512.
9. Холера: ее причины, течение, лечение и предупреждение // МЕВ. – 1890. – № 17 (1 сент.). – С. 521–528.
10. Холера: ее причины, течение, лечение и предупреждение, окончание // МЕВ. – 1890. – № 18/19 (15 сент., 1 окт.). – С. 552–558.
11. Береженого Бог бережет: наставления для сельских жителей, как блюсти себя, дабы Господь привел уберечься от заболевания холерою // МЕВ. – 1892. – № 15 (1 авг.). – С. 445–448.
12. Простой способ очищения воды // Минские епархиальные ведомости. – 1892. – № 16 (15 авг.). – С. 476.
13. Обязательные постановления о мерах предупреждения и борьбы с холерною эпидемией в городах и местечках Минской губернии // МЕВ. – 1905. – № 9 (1 мая). – С. 109–115.
14. Меры личного предохранения против холеры // МЕВ. – 1907. – № 18 (15 сент.). – С. 349–351.
15. Наставления о мерах личного предохранения от холеры // МЕВ. – 1908. – № 18 (15 сент.). – С. 223–228.
16. Берегитесь холеры // МЕВ. – 1908. – № 19 (1 окт.). – С. 233–234.
17. Лечение холеры простоквашей // МЕВ. – 1912. – № 16 (15 авг.). – С. 606.



**Давидовская О.Н.**


## ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КОМИТЕТОВ ПОПЕЧИТЕЛЬСТВА О НАРОДНОЙ ТРЕЗВОСТИ В ВИТЕБСКОЙ ГУБЕРНИИ ЗА ПЕРВЫЙ ГОД СУЩЕСТВОВАНИЯ (1897–1898) ПО МАТЕРИАЛАМ «ВИТЕБСКИХ ГУБЕРНСКИХ ВЕДОМОСТЕЙ»


*Ключевые слова: винная монополия, «Витебские губернские ведомости», попечительные комитеты, трезвость, народные чайные.*


Попечительство о народной трезвости было создано в Российской империи одновременно с введением питейной (винной) монополии в 1894 г. с целью ограничения чрезмерного потребления населением алкоголя путём организации здорового досуга и просветительской деятельности. Губернские и уездные комитеты попечительства должны были открывать народные чайные, столовые, библиотеки, организовывать народные чтения, концерты, спектакли; содействовать открытию и содержанию лечебных приютов для страдающих запоем; осуществлять надзор за торговлей крепкими напитками в соответствии с установленными правилами; содействовать другим учреждениям, «стремящимся к достижению тех же целей» [23].

Введение винной монополии осуществлялось в несколько этапов. Первыми губерниями, которых коснулись реформы, стали Пермская, Оренбургская, Уфимская и